# STUDIA
# THEOLOGICA
# GRODNENSIA

Зборнік навуковых артыкулаў

Заснаваны ў 2007 годзе

ВЫПУСК 14

Гродзенская дыяцэзія Рымска-Каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь
2021 г.

УДК 272(476.6-25)(082)

IMPRIMATUR
Grodno, dnia 3.12.2019 r.
Nr 432/19.
Alexander Kaszkiewicz
Biskup Grodzieński

KOLEGIUM REDAKCYJNE:
O. dr Andrzej Szczupał CSsR – redaktor naczelny
Dr Larysa Michajlik – sekretarz redakcji
Ks. dr Aleksander Mackiewicz
Ks. dr Roman Raczko
Ks. dr Jerzy Powajbo

KONSULTACJA NAUKOWA:
Ks. prof. dr hab. Stanisław Urbański

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:
А. д-р Андрэй Шчупал CSsR – галоўны рэдактар
Д-р Ларыса Міхайлік – сакратар рэдакцыі
Кс. д-р Аляксандр Мацкевіч
Кс. д-р Раман Рачко
Кс. д-р Юры Павайба

НАВУКОВЫ КАНСУЛЬТАНТ:
Кс. праф. д-р хаб. Станіслаў Урбаньскі

ISBN 978-985-7132-23-2

© Гродзенская дыяцэзія Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь, 2021

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ,

Мы вельмі рады, што пасля гадавога перапынку, выкліканага незалежнымі ад нас прычынамі і абставінамі, мы можам прапанаваць вам чарговы, чатырнаццаты нумар нашага навуковага часопіса «Studia Theologica Grodnensia». Нам прыемна, што нашы аўтары, якія з»яўляюцца выдатнымі спецыялістамі ў розных галінах навукі, зноў могуць падзяліцца з вамі вынікамі сваёй аналітыкі і сваіх даследаванняў. Спадзяемся, што азнаямленне з артыкуламі у гэтым нумары навуковага альманаха не толькі паглыбіць вашыя веды па асобных навуковых праблемах, але і ў вялікай меры даставіць вам сапраўднае інтэлектуальнае задавальненне.

Гродзенская дыяцэзія разам са сваім першым біскупам ардынарыем Аляксандрам Кашкевічам святкуе сваё 30-годдзе. Вельмі важнай падзеяй гэтага юбілею стала прызначэнне Святым Айцом Францішкам 14 верасня 2021 г. дапаможнага біскупа нашай Гродзенскай дыяцэзіі Юзафа Станеўскага – Арцыбіскупам Мітрапалітам Мінска-Магілёўскім. На пасадзе дапаможнага біскупа арцыбіскуп Ю. Станеўскі выконваў таксама абавязкі Генеральнага сакратара Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў Беларусі. Яго ўрачысты ўваход у мінскую катэдру адбыўся 23 кастрычніка 2021 года. Жадаем кс. Арцыбіскупу багацця Божых ласкаў, неабходных для кіраўніцтва Касцёлам у Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі.

Сёлетні нумар часопіса адкрывае артыкул знакамітага навукоўца, сусветна вядомага спецыяліста ў галіне хрысціянскай духоўнасці і містыкі, аўтара шматлікіх навуковых публікацый кс. праф. доктара хаб. Станіслава Урбаньскага пад назвай "Святасць хрысціяніна ў святле апостальскай адгартацыі Папы Францішка *Gaudete et Exsultate*". Аўтар артыкула падкрэслівае наватарскі падыход Святога Айца да тэмы хрысціянскай святасці, таму што ў аналізаваным папскім дакуменце гэтае пытанне ўпершыню выкладзена комплексна і сістэмна, у тэарэтычным і практычным аспектах. Надзвычай важным і павучальным з'яўляецца падкрэсленне Святым Айцом таго факту, што хрысціянская святасць — гэта шлях узрастання ў любові да Бога, якая рэалізуецца ў штодзённым жыцці ў форме любові да бліжняга. Любоў — гэта асаблівая місія хрысціяніна ў свеце, таму кожны паслядоўнік Хрыста, асвячаючы сябе, становіцца, тым самым, яшчэ больш вартасным і запатрабаваным членам грамадства.

Аматараў біблеістыкі абавязкова зацікавіць яшчэ адзін артыкул выдатнага біблеіста, маючага міжнародае прызнанне, спецыяліста ў галіне перакладазнаўства кс. доктара Даніэля Дзікевіча. Прапанаваная публікацыя з»яўляецца трэцяй і апошняй часткай ужо вядомай чытачам серыі артыкулаў (пар. *STG* 12 і 13), у якой аўтар аналізуе некаторыя недахопы апошняга нямецкамоўнага выдання Святога Пісання, г.зв. адзінага перакладу (*Einheitsübersetzung*) з 2016 года. На думку аўтара, некаторыя змены, унесеныя ў паўторна перакладзены біблейскі тэкст, з'яўляюцца вельмі няўдалымі з тэалагічнага пункту гледжання, і таму гэты пераклад патрабуе карэкціроўкі і далейшага ўдасканалення.

3. Жлутка, А. Каранацыя Міндоўга і заснаванне першага біскупства ў дакументах XIII ст. / А. Жлутка // Наша вера. – 2003. – №2. – С. 41.
4. Жлутка, А. Ад місіі апостала Андрэя да пантыфікату Яна Паўла II / А. Жлутка // Ян Павел II – чалавек веры і культуры. Матэрыялы Міжнароднага сімпозіума. – Мінск : Про Хрысто, 2006. – С. 122.
5. Краўцэвіч, А. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага / А. Краўцэвіч. – Rzeszów, 2000. – С. 150 – 161.
6. Краўцэвіч, А. Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага. 1248 – 1377 / А. Краўцэвіч. – Гародня-Уроцлаў, 2015. С. 42 – 45..
7. Błaszczyk, G. Dzieje stosunków polsko-litewskich od czasów najdawniejszych do współczesności / G. Błaszczyk. – Poznań : UAM, 1998. – S. 195 – 267.
8. Dunin-Kozicki, Z. Szczątek kalendarza Franciszkanów wileńskich z XV wieku / Z. Dunin-Kozicki // Kwartalnik litewski. – 1910. – №4. – С. 3 – 12.
9. Makarcyk, J. Początki działalności franciszkanów w Wielkim Księswie Litewskim // Studia Theologica Grodnensia. – 2013. – Выпуск 7. – С. 186 – 204.
10. Wisner, H. Unia: Sceny z przeszłości Polski i Litwy / H. Wisner. – Warszawa, 1988. С.23 – 39.

RESUME

Artykuł naświetla historię i rolę Kościoła katolickiego na ziemiach białoruskich Wielkiego Księstwa Litewskiego na podstawie ekspozycji Grodzieńskiego Państwowego Muzeum Historii Religii. Ukazuję, że w epoce Wielkiego Księstwa Litewskiego nastąpiło nasilenie wpływów Kościoła. Rozprzestrzenianie się katolicyzmu w państwie w owym okresie stymulowało między innymi rozwój kultury ziem białoruskich. Kościół Rzymskokatolicki, będąc ściśle związany z kulturą zachodnioeuropejską, wprowadzał na tereny wschodnie charakterystyczne dla niego modele życia, zachowania, praktyki społecznej i artystycznej. Głównymi nosicielami katolickiej tradycji kulturowej były w epoce WKL zakony katolickie, które odgrywały czołową rolę w szerzeniu katolicyzmu na ziemiach białoruskich.

SUMMARY

The article deals with the history and the role of the Catholic Church in the Belarusian territory of the Grand Duchy of Lithuania, based on the exposition of Grodno State Museum of the History of Religion. It shows, that in the period of GDL the influence of the Church increased. The spread of Catholicism in the state during that period stimulated, among other things, the development of culture of the Belarusian lands. The Roman Catholic Church, being tightly connected with the West European culture, introduced to the Eastern territories its specific ways of life, behavior, social and artistic practices. The main bearers of the Catholic cultural tradition during the period of GDL were Catholic religious orders, which played a key role in the spread of Catholicism in the Belarusian territories.

*Уладзімір Ляўшук*

# ARTE ET HUMANITATE, LABORE ET SCIENTIA. НАТАТКІ ДА 400-ГОДДЗЯ ГРОДЗЕНСКАГА ОРДЭНСКАГА ДОМА ТАВАРЫСТВА ЕЗУСА

У дзень 29 красавіка 1621 г. султан Асман II на чале янычараў выйшаў са Стамбула на вайну з Рэччу Паспалітай. Фіналам вайны стала драматычная аблога лагера літоўска-польска-казацкіх войскаў пад Хоцінам. Абаронай камандаваў самы выдатны палкаводзец Еўропы гэтага часу, які ў 1605 г. разграміў шведаў пад Кірхгольмам, вялікі гетман літоўскі Ян Караль Хадкевіч (1560–1621). Бітва пад Хоцінам доўжылася 40 дзён. Сярод абложаных і праціўнікаў пачалася эпідэмія «малдаўскай гарачкі». 24 верасня ад яе памёр Я. К. Хадкевіч. Туркі, даведаўшыся пра гэта, пайшлі на генеральны штурм. Абаронцы Хоціна вытрымалі дзевяць атак і ўтрымаліся на месцы. Паводле падання, у вечар 28 верасня ў іх засталася толькі бочка пораху. Раніцай наступнага дня туркі прапанавалі мір, што знясіленымі абложанымі было ўспрынята як цуд. Яго аднеслі на рахунак малітоўнага пасрэдніцтва святога Станіслава Косткі. Спыненне турак пад Хоцінам было настолькі значным для сучаснікаў, што папа Рымскі Рыгор XV усталяваў штогадовую ўрачыстую літургію ў знак удзячнасці і змясціў яе ў літургічным календары каталіцкай царквы ў дзень 10 кастрычніка. Візію айца Таварыства Езуса Мікалая Аборскага, які ўбачыў у аблоках над Хоцінам Маці Божую з Дзіцём і святога юнака Станіслава Костку, які моліцца каля ее ног, можно і сёння кантэмпляваць у правым алтары трансэпту Гродзенскай катэдры.

Разам з вялікім гетманам Хадкевічам, які, дарэчы, быў цесна звязаны з Ваўкавышчынай і Бераставіччынай, з-пад Хоціна не вярнулася шмат гродненцаў. У іх ліку быў гродзенскі староста Станіслаў Касабуцкі (Kossobudzki). Адпраўляючыся пад Хоцін, ён напісаў тэстамент, якім, у выпадку невяртання з бою, перадаваў вёску Сухая Баля для забеспячэння фундацыі езуітаў у Гродне. У 1622 г. езуіты вырашылі спрэчныя пытанні са спадчыннікамі Касабуцкага і прыбылі ў горад.

Гэта адбылося праз 35 гадоў пасля нерэалізаваных планаў Стэфана Баторыя заснаваць у Гродне калегіум. Пра тыя планы вядома, што кароль у 1585 г. запісаў 10 000 флорынаў для фундацыі гродзенскага калегіума і прыступіў да будаўніцтва касцёла. Для Баторыя гэта было настолькі важна, што ён звярнуўся наўпрост (ў абыход правінцыяла і генерала) да папы Рыгора XIII (1572–1585), а той ужо настойліва рэкамендаваў генералу Клаўдыё Аквавіве (1543–1615) прыняць фундацыю ў выглядзе выключэння з правілаў[1].

1 Załęski, S. Jezuici w Polsce : w 5 t. – Lwów ; Kraków : Drukiem i nakładem, drukarni ludowej,

Навошта Баторыю былі патрэбны такія намаганні і паспешлівасць? Гістарыёграфы праўлення Стэфана Баторыя, пачынаючы ад Рэйнгольда Гейдэнштэйна (Heidenstein, 1553–1620), падкрэсліваюць цеснае ўзаемадзеянне караля і езуітаў. Аднак нікім з іх не адзначана акалічнасць, што, за выключэннем Полацка, каралеўскія фундацыі езуітаў, як здзейсненыя, так і запланаваныя, размяшчаліся на геаграфічнай карце практычна ўздоўж прамой лініі: тры кропкі ў Трансільваніі, а затым – Брэст, Гродна, Вільня, Рыга, Дэрпт[2]. На адрэзку паміж Трансільваніяй і Брэстам на гэтай лініі апынуліся калегіум у Львове і ў Любліне, фундаваныя ў той час мясцовымі біскупамі. Прававы статус Інфлянт (Лівоніі) дазваляў Баторыю разлічваць на перадачу гэтай тэрыторыі ў спадчыннае валоданне магчымым нашчадкам.

Калі б смерць не перакрэсліла яго планы, то шлях з роднай каралю Трансільваніі ў адваяваныя ім Інфлянты (Лівонію) ўяўляў бы сабой ланцуг з размешчаных прыкладна на роўных адлегласцях езуіцкіх калегіумаў, якія па сутнасці былі вузламі інфраструктуры, гатовай у любы момант прыняць каралеўскі двор і разгарнуць функцыянаванне дзяржаўнага апарата. Гэта цалкам адпавядае папулярнай версіі, што Гродна ў цэнтры гэтага ланцуга разглядаўся Стэфанам Баторыем як будучая сталіца дзяржавы.

Фундаваны Баторыем для езуітаў касцёл будаваўся вельмі хутка, але смерць караля наступіла яшчэ хутчэй. Пасля гэтага палітычнае жыццё зноў перамясцілася ў Кракаў і Вільню. Правінцыял езуітаў саступіў недабудаваны касцёл пробашчу гродзенскай парафіі. Падараваныя каралём зямельныя надзелы былі здадзеныя ў арэнду з накіраваннем плацяжоў на матэрыяльнае забеспячэнне Віленскай акадэміі.

Такім чынам грунтоўна і надоўга езуіты ў Гродне пачалі абасноўвацца толькі ў 1622 г. Пад канец года ў горад прыбылі айцец Адам Калазэмбскі (Kołozębski) і айцец Захар Скарульскі (Skorulski). Даходаў ад фундацыі Станіслава Касабуцкага хапіла толькі для адкрыцця ў горадзе місіянерскай станцыі, нават без ніжэйшай школы. Таму ад моманту пасялення двух езуітаў на місіянерскай станцыі да адкрыцця школы з класамі інфімы і граматыкі прайшло тры гады. Першапачаткова езуіты жылі ў доме сваяка а. Скарульскага старасты пярстуньскага Массальскага, потым у купленым доме недалёка ад парафіяльнага касцёла, дзе выконвалі функцыю прапаведнікаў і вялі іншую пастарскую працу, маючы ў распараджэнні адну капліцу і тры канфесіяналы[3].

Магдэбургскі статус Гродна і размяшчэнне яго сярод каралеўскіх сталовых маёнткаў не давала надзеі знайсці такога буйнога патрона, як Радзівілы ў Нясвіжы. Таму далейшае развіццё гродзенскага ордэнскага дома езуітаў было абумоўлена паступовым накапленнем асобных фундацый. Першай з іх стаў маёнтак Свіслач, падараваны былым пробашчам гарадзенскай парафіі смаленскім біскупам Францішкам Ісайкоўскім. Наступнае значнае павелічэнне рэсурснай базы гродзенскіх езуітаў адбылося ў выніку дару Кшыштафа Халецкага, які адпісаў ім маёнткі Хорастаў, Калбасіно і

1900–1906. – T. I : Walka z różnowierstwem. 1555–1608, cz. I : 1555–1586. – S. 370–374

2 Carrez, L. Atlas Geographicus Societatis Jesu / L. Carrez. – Paris : apud Georgium Colombier, 1900. – S. 12.

3 Załęski, S. Jezuici w Polsce : w 5 t. – Lwów ; Kraków : Drukiem i nakładem drukarni ludowej, 1900–1906. – T. IV : Dzieje 153 kolegiów i domów Jezuitów w Polsce, cz. III : Kolegia i domy założone w drugiej dobie rządów Zygmunta III i za rządów Władysława IV 1608–1648. – S. 1226.



Малахавічы, што недалёка ад горада, а таксама дзякуючы дару езуіта Гераніма Дзевалтоўскага, які перад прынясеннем прафесіі (чатырох апошніх вячыстых манаскіх шлюбаў у асаблівай урачыстай форме) запісаў Таварыству сваю радавую вёску Шупене[4].

У 1630 г. у школе была заснавана Марыянскія Кангрэгацыя студэнтаў і музычная бурса. Гэта азначала, што гродзенскі ордэнскі дом Таварыства Езуса ўмацаваў пазіцыі і ўступіў у перыяд росквіту.

У езуіцкай школе паслядоўна, дзень за днём вучылі латыні. Навучанне ішло праз вусныя маўленчыя практыкі малымі порцыямі. Порцыя вызначалася памерам васковай таблічцы вучня. Важна, што пісьмо служыла толькі для спрашчэння запамінання, але не для захоўвання інфармацыі. Навучэнцы рухаліся ўслед за выкладчыкам, які пастаянна «скармліваў» ім порцыі правільнай вуснай лацінскай мовы, ідучы па прыступках складанасці ў класах інфімы, граматыкі, сінтаксы, паэтыкі і рыторыкі. Курс калегіума быў разлічаны на пяць гадоў, але пры наяўнасці здольнасцей мог быць скончаны хутчэй. Навучэнцы пры дапамозе вусных мнеманічных тэхнік трывала ўкладвалі ў памяці корпус лацінскіх тэкстаў антычных і хрысціянскіх аўтараў, вылучыўшы з іх топасы – агульныя месцы (loci communes). У класе рыторыкі на базе топасаў вучыліся складаць уласныя стылістычна бездакорныя паэтычныя і празаічныя канструкцыі[5].

З топасаў, якія ператвараліся ў каркас вусных і пісьмовых маўленчых практык, складвалася адзіная паняційная сфера, якая аб'ядноўвала выпускнікоў калегіума ў асаблівы культурны пласт. Яны не мелі патрэбы ўзгадняць паняцці пры зносінах на тэмы больш складаныя, чым бытавыя. Таму што адназначна разумелі адзін аднаго з паўслова. З 1599 г. і да другой траціны XVIII ст. набор лацінскіх тэкстаў для вывучэння ў калегіуме быў цверда замацаваны ў «Ratio studiorum» (езуіцкім школьным статуце). Адпаведна, і комплекс топасаў, які адтвараўся калегіумам, заставаўся амаль нязменным. Тэксты, якія гучалі ў езуіцкіх класах (адсюль назва «класічныя»), тычыліся толькі вечнага і нятленнага, таго, што адносіцца да высокай культуры. З іх былі наўмысна выключаны пазітыўныя («карысныя») веды, неабходныя для эканамічна эфектыўнага ўзаемадзеяння са зменлівым матэрыяльным светам. Таму можна сцвярджаць, што езуіцкія калегіумы служылі кропкамі ўзнаўлення культурных узораў, якія складалі культурную матрыцу палітычнага народа Рэчы Паспалітай – шляхты. Вучоба ў калегіуме праходзіла ў адрыве ад бацькоў у мужчынскім асяроддзі і нярэдка суправаджалася цялеснымі пакараннямі і іншымі цяжкасцямі. У тэрмінах сёнешнай педагогікі можна лічыць яе своеасаблівай ініцыяцыяй маладога хлопчыка ў дарослага прадстаўніка эліты прывілеяваных саслоўяў ВКЛ – шляхты і духавенства.

Кантрольнымі кропкамі ў працэсе духоўна-маральнага выхавання ў калегіуме былі акты штомесячнай споведзі. У асаблівых выпадках навучэнцы-члены Марыянскай садаліцыі ў класе рыторыкі маглі спавядацца раз на тыдзень. Перад споведдзю навучэнец заставаўся сам-насам і выпрабоўваў сумленне паводле тыпавага фармуляра. З такога фармуляра, прыведзенага ў дапаможніку для езуітаў-настаўнікаў

4 Ibidem, s. 1227.

5 Natoński, B. Szkolnictwo jezuickie w Polsce // Z dziejów szkolnictwa jezuickiego w Polsce : wybór artykułów / oprac. J. Paszenda. – Kraków, 1994. – S. 33–62.

а. Стэфана Шчанецкага (1658–1737), можна даведацца, што ідэальны навучэнец калегіума павінен быў культываваць пакору пачуццяў (не разглядаць непрыстойнае, быць стрыманым у ежы, пітве і сне), быць стрыманым у мове (не сварыцца, не хлусіць, не ачарняць і не вінаваціць іншых, не балбатаць пустое), кантраляваць думкі і эмоцыі (пазбягаць зайздрасці, падазронасці, гневу, жадання помсты і пачуцця радасці ад чужых няўдач), імкнуцца здзяйсняць добрыя ўчынкі, але цурацца боек, крадзяжу і «нясціплых дотыкаў»[6]. Характэрна, што пытанняў аб рэлігійных практыках у фармуляры выпрабаванні сумлення зусім няшмат і яны гучаць у кантэксце пажаданняў любіць Бога перадусім.

Музычная бурса пры Гродзенскім калегіуме Таварыства Езуса была фармальна самастойнай і незалежнай ад калегіума, у той жа час была ўцягнута ў яго ўнутранае жыццё. Для бурсы была прадугледжана асобная фундацыя. У якасці ўстаноўчага фонду бурсы гродзенскія езуіты ў 1630 г. атрымалі 3000 злотых, гадавы працэнт у памеры 250 злотых быў прызначаны на ўтрыманне бурсы.У 1665 г. на гэтую мэту выдаткавана 250 злотых, а ў 1737 – 300 злотых. Бурса забяспечвала ўтрыманне і навучанне 5 хлопчыкаў. З цягам часу яны выходзілі на самастойны хлеб, у тым ліку ў складзе платных музыкаў музычнай капэлы пры езуіцкім касцёле[7].

Адукацыйны працэс і распарадак дня музыкаў, якія пражывалі ў бурсе, паўтаралі формы, прынятыя ў калегіуме. Атрымаўшы ў бурсе звычайна пяцігадовую музычную адукацыю, яе выпускнікі працавалі на музычнай ніве горада і гродзенскіх ваколіц. Сеймавы статус Гродна абумоўліваў досыць частае знаходжанне ў Гродне каралеўскага і магнацкіх аркестраў, што дазваляла гродзенскім бурсістам знаёміцца з музычнымі навінкамі, слухаць выкананне самых выдатных віртуозаў Рэчы Паспалітай. Рэлігійны рэпертуар капэлы Гродзенскай бурсы, з аднаго боку, дэманстраваў ўспрымальнасць ёю актуальных плыняў з еўрапейскай касцельнай музыкі, а з другога – наяўнасць высокага ўласнага кампазітарскага патэнцыялу. Калі ў 1769 г. падскарбі надворны літоўскі і староста гродзенскі Антоні Тызенгаўз стварыў у Гродне тэатральна-музычную школу, выпускнікі якой пазней склалі аснову Варшаўскай каралеўскай оперы, то яму не прыйшлося пачынаць на пустым месцы. Навучэнцы рэкрутаваліся з бліжэйшых вёсак, а ў глядзельнай зале збіралася мясцовая шляхта. І адны, і другія ўжо знаходзіліся пад музычным уплывам капэлы Гродзенскай бурсы, а таксама яе выпускнікоў – кантараў і арганістаў навакольных касцёлаў.

Жыццё калегіума не абмяжоўвалася толькі заняткамі ў класах. Дакладней, заняткі ў класах былі значна больш разнастайнымі, чым у сучаснай школе. З першых дзён працы школы і да роспуску ордэна актыўна працаваў школьны тэатр, які быў абавязковым элементам дыдактычнага працэсу. У адрозненне ад вельмі рэдкіх сучасных школьных тэатраў, у калегіуме тэатр адыгрываў выключна ўтылітарную ролю, забаўляльная ж функцыя была на другім плане.

Справа ў тым, што ва ўмовах палітычнага рэжыму шляхецкай дэмакратыі паспяховасць жыццёвай кар’еры маладога шляхціца шмат у чым залежала ад яго пісь-

6 Kochanowicz, J. Podręcznik pedagogiki Stefana Sczanieckiego SJ z 1715 roku. Professio circa puerorum in virtute, sapientia et politie institutionem / J. Kochanowicz. – Kraków : Wydawnictwo WAM, 2001. – S. 75–79.

7 Ляўшук, У. Qui Cantu Templum Exornabant, або аповесць пра музычную бурсу ў Гародні // Гарадзенскі гадавік. – №3. – 2014. – С. 11–16.



меннасці і прамоўніцкага майстэрства. Дадзеныя якасці маглі адкрыць яму дарогу да выбарных пасадаў і звязаных з імі даходаў. Кар’ера кліента, якая прыносіць прыбытак пры двары магната, таксама патрабавала пэўнай ступені абчасанасці і куртуазнасці, якую малады чалавек набываў падчас падрыхтоўкі прадстаўленняў школьнага тэатра, а затым меў магчымасць прадэманстраваць перад прысутнымі ў першых шэрагах уплывовымі прадстаўнікамі кіруючых колаў. У гэтым сэнсе гарадзенскі калегіум меў відавочныя выгады. На шляху з Варшавы ў Вільню і назад у горад часта наведваліся каралі Рэчы Паспалітай, магнаты і біскупы, затым тут сталі праводзіцца соймы. Мясцовым студэнтам гэтыя падзеі служылі аказіяй для дэманстрацыі прамоўніцкага і сцэнічнага майстэрства. Трэба адзначыць, што частка праграмаў відовішчаў гродзенскага калегіума захавалася і досыць даўно апублікаваная, але да гэтага часу не патрапіла ў поле ўвагі беларускіх даследчыкаў культуры.

У 1633 г. былі створаны ўмовы (набыты матэрыяльныя рэсурсы калегіумам і падрыхтаваны выкладчыцкія кадры правінцыяй ордэна), каб дадаць у адукацыйную праграму школы клас паэтыкі. На працягу двух наступных гадоў гродзенская езуіцкая місія авансавала да ўзроўня рэзідэнцыі. Калі ж у 1645 г. дадаўся клас рыторыкі, то меркавалася на працягу некалькіх гадоў падняць школу да ўзроўня поўнага калегіума. Але чаканні не спраўдзіліся. У 1648 г. пачаліся войны. Падчас нашэсця маскоўскіх войскаў у 1655–1662 гг. горад быў цалкам спалены і спустошаны, а рэзідэнцыя Таварыства Ісуса спыніла сваю дзейнасць, а езуіты разам з жыхарамі горада хаваліся ў лясах[8] [3, с. 1229].

Новы этап развіцця гродзенскай школы езуітаў адзначыўся карэннымі зменамі ў знешнім асяроддзі. Пасля заканчэння паласы войнаў сярэдзіны XVII ст. скончылася эпоха рэлігійнай талеранцыі і настаў час супрэматыі каталіцызму. У адукацыйнай прасторы гэта спрыяла поўнаму дамінаванню езуіцкай школьнай сістэмы, якая валодала ўнутранымі механізмамі для хуткага нарошчвання колькасці высокаматываваных настаўніцкіх кадраў.

У 1664 г. школа Таварыства Ісуса ў Гродне зноў адчыніла дзверы студэнтам. Але ўжо ў рангу поўнага калегіума. У дзень інаўгурацыі 1664/65 навучальнага года члены Марыянскай Кангрэгацыі студэнтаў «для ўзняцця духу ва ўмовах жудаснага вакол спусташэння» ўрачыста перанеслі з вёскі Кульбакі каля Гродна ў свой Касцёл «цудамі славуты» абраз Найсвяцейшай Панны Марыі Снежнай. Гэты абраз – пісаная на медзі копія з рымскага арыгінала – дагэтуль знаходзіцца ў былым езуіцкім касцёле ў Гродне і носіць назву іконы Найсвяцейшай Панны Марыі Кангрэгацкай або Студэнцкай[9].

Па Канстытуцыі 1673 г. горад Гродна быў вызначаны месцам для кожнага трэцяга сойма Рэчы Паспалітай за выключэннем элекцыйных, канвакацыйных і карана-

8 Załęski, S. Jezuici w Polsce : w 5 t. – Lwów ; Kraków : Drukiem i nakładem drukarni ludowej, 1900–1906. – T. IV : Dzieje 153 kolegiów i domów Jezuitów w Polsce, cz. III : Kolegia i domy założone w drugiej dobie rządów Zygmunta III i za rządów Władysława IV 1608–1648. – S. 1229.

9 Biblioteka Uniwersytetu Warszawskiego, sygnatura Sd. 713.1920: Summaryusz Cudow yłask Znákomitszych Naświętszey Panny MaryeyStudentskiey w Kongregaciey GrodźieńskieyIchmośćiow PP. Studentow, pod titułem Annuntiationis, u WW. Oycow Societatis IESUNa rozżarzenie ufnośći Utrapionych zebrany, a zadozwoleniem Iaśnie Wielmożnego PrzewielebnegoIegomośći X. Alexandra Kotowicza BiskupaWileńskiego do druku podany w Wilnie wDrukarni Soc: IESU, Roku Zbawienia 1686.

цыйных. Гэта быў зручны выпадак гораду адбудавацца, а гараджанам наблізіцца да цэнтру прыняцця фінансавых і палітычных рашэнняў, якім быў сойм. Вядома, што падчас соймаў гродзенскія езуіты казалі пропаведзі на польскай і нямецкай мовах, арганізоўвалі спецыяльныя служэнні.

Апошняя чвэрць XVII ст. ў гісторыі гродзенскага калегіума характарызуецца імклівым ростам. У тры прыёмы ў 1677–1684 гг., у 1691 г. і ў 1722–1744 гг. езуіты ўзвялі шырокі каменны будынак Калегіі, які падчас соймаў таксама здавалі ў наём для соймавых камісій і канцылярый. Гадавы прыбытак гродзенскага дома Таварыства Ісуса складаў у 1639 г. – 300 злотых, у 1665 г. – 1000 злотых, 1705 г. – 3000 злотых, 1764 г. – 8062 злотых. Таму, калі ў XVII ст. калегія магла ўтрымліваць ад 7 да 20 чалавек, то ў XVIII ст. – ад 26 да 38 чалавек[10].

Акадэмічная супольнасць калегіума вырасла настолькі, што для абслугоўвання патрэбаў сваіх членаў яму спатрэбілася вылучыць новае структурнае падраздзяленне – аптэку. Яе заснавалі пры калегіі ў 1687 г. Тут трэба адзначыць, што традыцыю пільнай увагі да здароўя навучэнцаў заклаў яшчэ Ігнацы Лаёла, які патрабаваў ад правінцыялаў і рэктараў асаблівага клопату аб высокіх санітарных нормах вучобы і побыту навучэнцаў і выкладчыкаў у калегіумах. Поспеху аптэкі спрыяла традыцыя езуіцкіх аптэкараў дзяліцца паміж сабой медычнымі сакрэтамі і рэцэптурай лекаў. Так, з 1643 г. аптэкі Таварыства славіліся эфектыўным супрацьмалярыйным *pulver jesuiticus* «езуіцкім парашком» (які ўяўляў сабой цёртую кару хіннага дрэва) – яго распаўсюдзілі па Еўропе езуіты Паўднёвай Амерыкі.

Прафесія аптэкара была досыць рэдкай у Таварыстве, і таму ўсе пятнаццаць гродзенскіх аптэкараў вядомыя па імёнах. Але гэта не значыць, што езуіт-аптэкар чым-небудзь адрозніваўся ад іншых членаў Таварыства Ісуса. Знаходжанне на пасадзе аптэкара доўжылася тры-максімум чатыры гады, а затым брат або айцец-аптэкар перамяшчаўся на новае месца. На яго ж месца правінцыял прызначаў каго-небудзь іншага, прычым не заўсёды аптэкара па прафесіі. Аптэка адыгрывала толькі дапаможную ролю ў галоўнай справе Таварыства, якая, як вядома, заключалася ў фарміраванні ў маладога пакалення «навуковай і красамоўнай пабожнасці».

Яшчэ адным сведчаннем росквіту Гродзенскага калегіума езуітаў служыць паўстанне залежных ад яго місіянерскіх станцый у Гольне (1664), Котры (1664), Дзембраве (1676), Мерачы (1676) і Ратніцы (1676), Ваўкавыску (1736) і Урдаміне (1756). У Кашубінцах каля Котры гарадзенскія езуіты за свой кошт пабудавалі драўляны касцёл, у якім затым праводзіліся каталіцкія набажэнствы для мясцовай шляхты, а таксама ўніяцкія для падданых сялян. У Мерачы ў 1696 г. была адкрыта школа, адукацыйная праграма якой у 1726 г. пашырана на курс граматыкі, а ў 1747 г.на курсы паэтыкі і гісторыі. Місіянерская праца гродзенскіх езуітаў у Ваўкавыску таксама прынесла плён у выглядзе граматычнай школы[11].

Цудоўны ўласны касцёл Св. Францішка Ксаверыя гродзенскія езуіты будавалі ў 1678-1705 гг. Служэнне ў касцёле пачаліся ў 1700 г., а ўрачыстае прысвячэнне яго Св. Францішку Ксаверыю адбылося ў 1705 г. у прысутнасці саюзнікаў у вайне су-

10 Paszenda, J. Kościół pojezuicki (farny) w Grodnie // Kultura artystyczna Wielkiego Księstwa Litewskiego w epoce baroku / red. J. Kowałczyk. – Warszawa : Instytut Kultury, 1995. – S. 199–224.

11 Liaushuk, U. Terra Jesuitica Grodniensia, czyli o domach zakonnych zależnych od grodzieńskiego kolegium jezuickiego // Studia Paedagogica Ignatiana. – 2019. – T. 22. – № 4. – C. 49–72.



праць Швецыі: караля Рэчы Паспалітай Аўгуста II і расійскага цара Пятра I. У 1706 г. у прыбудаваную да касцёла капліцу быў перанесены цудоўны абраз Маці Божай Кангрэгацкай. У 1707–1709 гг. у касцёл з Кёнігсберга былі дастаўлены 6 бакавых алтароў працы Кшыштафа Пеўкера і яго майстэрні (Peuker, 1666–1735)[12].

Перыпетыі Паўночнай вайны, акрамя візітаў каранаваных асоб, неслі калегіуму і страты, прычым не толькі ад шведаў. У 1707 г. саюзніцкія маскоўскія войскі абрабавалі аптэку і бібліятэку. У гэтым жа годзе князь Галіцын выкраў з бурсы двух музыкаў і разам з гарматным абозам вывез іх у Маскву. У 1708 г. харугвы Сапегі знішчылі місіянерскую станцыю ў Гольне.

Тым не менш, пасля заканчэння Паўночнай вайны ранг гродзенскага калегіума зноў павысіўся. У 1709 г. у яго сценах стаў чытацца курс філасофіі для клірыкаў і пабудаваны асобны каменны будынак аптэкі. Курс філасофіі адносіў калегіум да вышэйшай школы. Следствам гэтага стала ўладкаванне ў 1713 г. новага памяшкання бібліятэкі і павелічэнне збору кніг.

Наступная фаза актыўнага развіцця пачалася ў трыццатыя гады XVIII стагоддзя пасля заканчэння паласы войнаў. Бачным знакам гэтага стала ўпрыгожванне касцёла ў 1736–1737 гг. галоўным алтаром працы Яна Хрысціяна Шміта з Рэшля (Jan Chrystian Schmidt, 1701–1759)[13]. Трохузроўневы скульптурны алтар паводле дамовы не мог мець сабе падобных. А ўнікальнасць, як вядома, каштавала грошай.

Менш заўважнай прыкметай з'яўлення новай адметнасці ў жыцці калегіума стала ўвядзенне ў яе адукацыйную праграму ў 1737/38 навучальным годзе маральнай тэалогіі. Тэалогія ў навучальным плане азначала набліжэнне калегіума да ўзроўня акадэміі/універсітэта, а гэта, у сваю чаргу, падштурхнула да развіцця матэрыяльнай базы. У 1744 г. да пачатку пасяджэнняў сойма было скончана будаўніцтва ўсяго комплекса будынкаў калегіума. Пра бурныя падзеі сойма 1744 г. можна прачытаць у польскай даследчыцы Зоф'і Зялінскай[14]. Калегіум удзельнічаў у яго падзеях апасродкавана. У касцёле Св. Францішка Ксаверыя спаведнікі сядзелі ў канфесіяналах, каб ні адзін ахвотны ачысціць душу не быў пазбаўлены гэтай магчымасці. Святары-апераріы служылі ватыўныя імшы па замове просьбітаў, якія вырашалі ў кулуарах сойма свае пытанні. Кожную нядзелю ў прысутнасці каралевы Марыі Юзэфы і яе фрауцымера для дэлегатаў сойма і гараджан прамаўляў пропаведзь пераведзены ў жніўні 1744 г. з Варшавы а. Фабіян Дахторавіч. Напярэдадні першага пасяджэння сойма яго пропаведзь кранула тэмы зорнага неба і зорак у тым сэнсе, што зоркі ззяюць на небе вечна, таму што не схільныя да зла карупцыі (гэта значыць іржы) у адрозненне ад людзей, чые душы не маюць зорнай трываласці і карумпаваныя прагай золата. Пропаведзі а. Фабіян апублікаваў[15] у 1748 г. Параўнанне іх зместу

12 Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego województwa trockiego : w 4 t. / red. Maria Kałamajska-Saeed. – Kraków : MCK, 2012–2018. – T. IV/2. – S. 25.

13 Przeracki, J. Artyści działający na Warmii w XVIII wieku (Krzysztof Peucker, Jan Chrystian Schmidt, Chrystian Bernard Schmidt, Krzysztof Sand, Jan Witt, Jan Ignacy Witt, Jan Antoni Frey, Piotr Andrzej Kolberg i Józef Joachim Korzeniewski) // Komunikaty Mazursko-Warmińskie. – 2011. – Nr 3. – S. 441–499.

14 Zielińska, Z. Walka "Familii" o reformę Rzeczypospolitej 1743–1752. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1983. – S. 87–158.

15 Głos poselski w głosie kaznodzieyskim, przedtym na seymie grodzieńskim, w kościele S. Franciszka Xawiera Societatis Jesu, przy łaskawey przytomności Nayiaśnieyszey Królowy Polskiey

з дыярыюшам сойма паказвае, што езуіты ў сваім касцёле імкнуліся падтрымаць дзеянні рэгалісцкай партыі.

Дэпутаты літоўскіх і польскіх правінцый падчас сойма збіраліся на асобных пасяджэннях-кансультацыях. Прадстаўнікам польскіх правінцый было адведзена памяшканне бібліятэкі калегіума. У выніку ў 1745 г. у бібліятэцы былі пастаўлены новыя шафы і змантаваныя жалезныя аканіцы. У 1752 г. канчаткова надбудаваны вежы і купалы касцёла. У 1763 г. надбудаваны паверх над аптэкай, а ў 1765 г. – ліхтар над галоўным купалам касцёла. У 1762 г. быў пашыраны змест курса тэалогіі і заснавана Брацтва Найсвяцейшага Сэрца Ісуса з мэтай пашырэння набожных практык у студэнцкім асяроддзі.

Пабожныя практыкі студэнтаў не заўсёды кампенсавалі буйныя норавы гродзенскіх студэнтаў. Пад канец кадэнцыі рэктара Казіміра Юрагі (Juraha, рэктар у 1749 – 1753 гг.) студэнты калегіума ўламіліся ў гарадскую турму, дзе сядзеў нейкі слуга падпалкоўніка камісара каралеўскіх эканомій, асуджаны за здзейсненае злачынства на смерць. «Разагнаўшы варту і выламаўшы дзверы, асуджанага пусцілі вольна». Камісар унёс скаргу ў трыбунал на рэктара і калегіум. Яны на суд не з’явіліся. Тады трыбунал завочна прысудзіў калегіуму «10 000 злотых грыўны і заезд на вёску Котра». Спатрэбілася шмат намаганняў рэктара Віленскай акадэміі Яна Юрагі (брата гродзенкага рэктара) і падскарбія літоўскага Юрыя Флемінга (Fleming, 1699–1771), каб трыбунал адхіліў свой прысуд і задаволіўся цялесным пакараннем студэнтаў, прызначаным ім рэктарам калегіума[16].

У 1765 г. гродзенскае староства ўзначаліў Антоній Тызенгаўз (1733–1785) надворны падскарбі літоўскі, які стварыў у Гродне, як выказваліся сучаснікі, «квітнеючую Галандыю». Адначасова з ўкараняемымі Тызенгаўзам навінкамі з’явіліся навацыі ў езуіцкім калегіуме. У 1770–1773 гг. тут сталі выкладаць матэматыку і сучасныя мовы: нямецкую і французскую. У 1772 г. быў нават адкрыты шляхецкі канвікт і яго прэфектам быў прызначаны Францішак Ксаверый Богуш (1746–1820), які адыграў значную ролю у далейшым развіцці сістэмы адукацыі Рэчы Паспалітай.

На жаль, гэтыя навацыі былі апошнімі. У 1773 г. у Рыме папа выдаў булу аб роспуску Таварыства Ісуса, якая па сутнасці разбурала існуючую больш за дзвесце гадоў адзіную еўрапейскую адукацыйную прастору і ўскосна стварала матэрыяльную базу для ўтварэння нацыянальных школьных сістэмаў. Квітнеючы гродзенскі калегіум быў перададзены новастворанай Камісіі нацыянальнай адукацыі, якая на яго базе ў Гродне стварыла акругову школу – адну з дзевяці ў Рэчы Паспалітай. Для калегіума гэта стала катастрофай. У 1772 г. яго кадравы склад налічваў 42 чалавекі. З іх месца у новай школе для працы і жыцця было прадастаўлена толькі васьмі прафесарам. Іроніяй лёсу склалася, што апошні рэктар калегіўма насіў прозвішчааднаго з двух першых езуітаў, прыбыўшых у Гродна ў 1622 г. Ім быў а. Юзаф Скарульскі (1718–1776)[17].

z zbawienną instrukcyą do uszu formowany, teraz dla obszernieyszey dusz ludzkich informacyi, drukarską sztuką na oko wydany 1748. W Warszawie w drukarni J.K. Mci y Rzeczypospolitey Kollegium Societatis Jesu. – 216 s.

16 Załęski, S. Jezuici w Polsce : w 5 t. – Lwów ; Kraków : Drukiem i nakładem, drukarni ludowej, 1900–1906. – T. III: Prace misyjne nad ludem 1648–1773. Cz. 2: 1700–1773 – 1902. – S. 1033.

17 Encyklopedia wiedzy o jezuitach na ziemiach Polski i Litwy 1564–1995 / oprac. L. Grzebień SJ przy współpracy zespołu jezuitów. – Kraków : WAM, 1996. – 888 s.



Напрыканцы кароткага нарысу пра езуіцкі калегіум ў Гродне трэба адзначыць, што, не гледзячы на салідны спіс даследванняў звязаннай з гродненскімі езуітамі праблематыкі, комплекснае апрапацаванне яго гісторыі ўсё яшчэ чакае свайго аўтара. Да гэтага трэба дадаць, што ва ўмовах гучных наракання ў на перманентную рэформу сучаснай школы падаецца вартым зірнуць больш уважліва на падставы езуіцкай адукацыйнай сістэмы, якая, будучы практычна нязменнай на працягу двух стагоддзяў гадоў, пазаставіла трывалыя сляды ў генетычным кодзе беларускай культуры.

## РЕЗЮМЕ

В статье обозначены основные вехи развития гроднеского орденского дома Общества Иисуса от момента основания миссии в 1622 г. до момента его ликвидации в ранге коллегиума с полным курсом философии в 1773 г. Отдельное внимание уделено незавершенной фундации коллегиума королём Стефаном Баторием в 1586 г. Кратко рассмотрены основные принципы учебного и воспитательного процесса в иезуитском коллегиуме, работа бурсы музыкантов и аптеки, участие коллегиума в работе гродненских сеймов.

## RESUME

Artykuł przedstawia główne etapy rozwoju Grodzieńskiego Domu Zakonnego Towarzystwa Jezusowego od momentu założenia misji w 1622 r. do momentu jej likwidacji w 1773 r. Wtenczas misja istniała w randze Kolegium, posiadającego pełny kurs filozofii. Szczególną uwagę autor poświęca fundacji Kolegium, niedokończonej przez króla Stefana Batorego w 1586 r. Krótko zostały naświetlone podstawowe zasady procesu nauczania i wychowania w kolegium jezuickim, funkcjonowania bursy muzyków oraz apteki, a także udziału kolegium w pracy Sejmów Grodzieńskich.

## SUMMARY

The author outlines the basic landmarks in the history of the congregational house of the Society of Jesus in Grodno from the moment of the mission’s foundation in 1622 till the moment of its dissolution as a collegium with the full philosophical course in 1773. Special attention is paid to the unfinished foundation of the collegiums by Sefan Batory in 1586. Basic principles of academic activities and educational process in the Jesuit collegiums, the functioning of the bursa of musicians and the pharmacy, participation of the collegiums in the work of the Grodno Sejms are briefly reviewed.

Zarząd szkoły rozpatrzył wniosek Stephenson w czerwcu 2011 r. i doszedł do wniosku, że powieść „Studium w szkarłacie" rzeczywiście zawiera negatywne wizerunki postaci historycznych społeczności mormońskiej, które mogą przyczynić się do powstania uprzedzeń. Zarząd szkoły stwierdził również, że nie można oczekiwać właściwego zrozumienia tego dzieła przez szóstoklasistów, a zatem nie należy zalecać jej czytania aż do dziesiątej klasy.

W związku z powyższym Zarząd Szkoły postanowił usunąć książkę z listy lektur szóstej klasy i zastąpić ją *Psem Baskerville›ów.* Pozostawił ją jednak w bibliotekach szkolnych szkół publicznych hrabstwa Albemarle, gdyż jak stwierdził „wszystko ma swój czas i miejsce w edukacji literackiej".

РЕЗЮМЕ

В данной статье автор рассуждает о неоднозначном отношении к секте мормонов (Церковь Иисуса Христа святых последних дней) на примере произведения Артура Конан Дойла «Этюд в багровых тонах». Это произведение вышло в свет в 1887 г., впервые открыв читателям образ гениального сыщика Шерлока Холмса и его друга доктора Ватсона. Произведение, однако, вызвало широкую дискуссию по поводу негативного отношения автора к мормонам, которых он изобразил изуверской и очень опасной сектой, к тому же практикующей многоженство и принуждение к супружеству. Автор вспоминает о прецеденте, случившемся в штате Вирджиния, где «Этюд в багровых тонах» даже убрали из школьной программы и задается вопросом: насколько объективным был взгляд А. Конан Дойла на мормонов XIX века? По его мнению, отношение к данной секте, выраженное писателем, было в большой мере обоснованным, поскольку Церковь мормонов действительно выступала за полигамию, лишение чернокожих возможности принятия священства и пр. Автор обращает внимание, что тема отношения к мормонам, затронутая в упомянутом выше произведении, остается дискуссионной и сегодня.

SUMMARY

In this article the author deals with the ambiguous attitude towards Mormons (the Church of Jesus Christ of Latter-day Saints) using the example of Arthur Conan Doyle's novel "A Study In Scarlet". This work was published in 1887, for the first time revealing the image of the genius detective Sherlock Holmes and his friend doctor Watson. However, the novel caused ample discussion concerning the writer's negative attitude to Mormons, whom he had depicted as a fiendish and very dangerous sect, practicing polygamy and forcing into marriage. The author mentions the precedent, which happened in the state of Virginia, where "A Study In Scarlet" was even removed from the school program, and wonders, how objective A. Conan Doyle's view on Mormons of 19th century was. In his opinion, the writer's attitude to this sect was to a great degree reasonable and legitimate, because the Church of Mormons really advocated polygamy, deprivation of black people of the right to become priests and so on. The author points out, that the topic of attitude towards Mormons, brought up in the above-mentioned novel, remains debatable even today.



# Змест

*УСТУП* ..... 5
*WSTĘP* ..... 10
*ВСТУПЛЕНИЕ* ..... 15

*Ks. Stanisław Urbański*
*ŚWIĘTOŚĆ CHRZEŚCIJANINA W ŚWIETLE ADHORTACJI APOSTOLSKIEJ GAUDETE ET EXSULTATE PAPIEŻA FRANCISZKA* ..... 21
Świętość codzienności i sąsiedztwa ..... 21
Istota świętości ..... 22
Przeszkody rozwoju świętości ..... 24
Błogosławieństwa Boże ..... 25
Cechy świętości ..... 27
Świętość jest drogą wspólnotową ..... 28
Walka, czujność i rozeznanie ..... 29
Zakończenie ..... 30

*Ks. Daniel Dzikiewicz*
*DIE REVIDIERTE AUSGABE DER EINHEITSÜBERSETZUNG*
*BEISPIELE NICHT GELUNGENER KORREKTUREN*
*EINFÜHRUNG* ..... 32
Die Beispiele nicht gelungener Korrekturen ..... 32
1. Gen 1,26b ..... 33
2. Gen 4,3-4 ..... 34
3. Mt 1,1 ..... 37
Schlusswort ..... 38

*Rev. Aleksander Romanovsky*
*GESÙ CRISTO L'UNICO MEDIATORE E SALVATORE.*
*TEOLOGIA DELLA MEDIAZIONE SALVIFICA DI CRISTO* ..... 41
1. Il senso della mediazione di Gesù. ..... 41
2. Il soggetto e la modalità di attuazione dell'opera di salvezza. ..... 44
3. La ricapitolazione dell'uomo in Cristo, senso della sua mediazione ..... 51
4. Gesù Cristo, mediatore unico e universale di salvezza ..... 52

*Кс. мгр. лiц. Юрый Пракапюк*
*ЗНАКІ ЗБАЎЧАЙ ЛАСКІ НА ШЛЯХУ ВЕРЫ: БОЖАЕ СЛОВА І САКРАМЭНТЫ – ІХ НАТУРА, ВАРТАСЦЬ І РЭЛЯЦЫЙНАСЦЬ* ..... 56
Рэляцыйнасць паміж Божым словам і сакрамэнтам ..... 56
Біблія аб збаўчым вымярэнні Божага слова ..... 58
Слова Божае ў Старым Запавеце ..... 58
Езус Хрыстус Словам Бога ..... 59
Божае слова ў навучанні Апосталоў і Святым Пісанні ..... 60

Збаўчае значэнне Божага слова........61
Адзінства слова і сакрамэнта........61
Розніца паміж словам і сакрамэнтам........62
Quasi-сакрамэнтальная якасць Божага слова. ........64

*Ks. Eugeniusz Amosionok*
*CZYM JEST MODLITWA JEZUSOWA?*
*JEJ POWSTANIE I ROZWÓJ W DUCHOWOŚCI PRAWOSŁAWNEJ* ........67
Historia kształtowania się modlitwy Jezusowej ........67
Elementy modlitwy Jezusowej ........71
Owoce modlitwy Jezusowej ........76
Podsumowanie ........79

*O. Andrzej Makowski CSsR*
*GŁOSZENIE HOMILII OBRZĘDOWYCH*
*W DUSZPASTERSKIEJ POSŁUDZE KOŚCIOŁA* ........82
1. Typy przepowiadania słowa Bożego........82
2. Przepowiadanie słowa Bożego w celebracji sakramentów ........83
3. Homilie obrzędowe........85
3.1. Cechy homilii obrzędowej ........86
3.2. Rodzaje homilii obrzędowej: historiozbawcza, teologiczno-tematycza i teologiczno-parenetyczna ........88
3.3. Kompozycja homilii obrzędowej ........90
Zakończenie ........91

*Ks. Jerzy Biegański*
*BÓG PRZEMAWIA W LITURGII PRZEZ CISZĘ* ........95
Wstęp ........95
Pojęcie ciszy w życiu człowieka........96
Znaczenia milczenie w liturgii........98
Rozwój milczenia w liturgii........99
Milczenie podczas Eucharystii, sakramentów świętych i sakramentaliów ........101
Wychowanie do milczenia w liturgii poprzez katechezę i praktykę........107
Problemy milczenia w liturgii ........108
Zakończenie ........109

*O. Waldemar Witold Żurek CSsR*
*INWENTARZ KOSCIOŁA PARAFIALNEGO W KOSOWIE POLESKIM W 1803 ROKU* ........111
Opis fizyczny dokumentu rękopiśmiennego........111
Stan zachowania dokumentu na dzień 9 sierpnia 2013 roku ........112
Nota edytorska ........112
Tekst księgi ........113

*A. Змiцер Чарнель CSsR*
*УНІЯЦКАЯ ЦАРКВА Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ: АД ПЕРАСЛЕДУ ДА ДАМІНАВАННЯ (1648 Г. – ПАЧАТАК XVIII СТ.)* ........144
1. Дзяржаўна-палітычнае становішча Рэчы Паспалітай у другой палове XVII ст. ........144
2. Уніяцкая Царква ва ўмовах казацкай і польска-маскоўскай вайны (1648-1667)........146

*Ігар Ганчарук*........158
*КАТАЛІЦКІ КАСЦЁЛ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ЭКСПАЗІЦЫІ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЕЯ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ)* ........158

*Уладзімір Ляўшук*
*ARTE ET HUMANITATE, LABORE ET SCIENTIA. НАТАТКІ ДА 400-ГОДДЗЯ ГРОДЗЕНСКАГА ОРДЭНСКАГА ДОМА ТАВАРЫСТВА ЕЗУСА* ........165

*Olga Gołąb*
*DZIAŁALNOŚĆ WYCHOWAWCZA I OŚWIATOWA KONGREGACJI ZAKONNYCH NA GRODZIEŃSZCZYZINIE OD XVI DO KOŃCA XVIII WIEKU*........174
Bernardyni i ich praca wychowawczo-dydaktyczna........176
Powstanie gimnazjum Jezuitów w Grodnie........178
Przybycie Jezuitów na Białoruś........179
Oddziaływanie formacyjno-oświatowe Franciszkanów w Grodnie ........194
Kursy filozofii ojców Karmelitów ........196
Wychowawcza rola zakonu żeńskiego Brygidek w Grodnie........197
Działalność duszpastersko-edukacyjna zakonu Pijarów........198
Powstanie pierwszej na Białorusi szkoły Pijarów w Woronowie ........200
Zorganizowanie szkoły średniej Pijarów – Collegium w Lidzie ........200

*Artur Wójtowicz*
*MORMONI W XX-LECIU MIEDZYWOJENNYM NA ZIEMIACH POLSKICH* ........208

*Renata Wierna*
*BLASK KAPŁAŃSTWA. BŁ. KS. HENRYK HLEBOWICZ (1904-1941)* ........213
*NA PODSTAWIE WSPOMNIEŃ „PŁOMIENNE SERCE”*........213
1. Charakterystyka dokumentu........213
2. Ks. Henryk Hlebowicz – rys biograficzny ........214
3. Działalność duszpasterska........216
3.1. Praca parafialna ........216
3.2. Na uniwersytecie Stefana Batorego ........217
3.3. Wśród młodzieży licealnej ........217
3.4. Działalność wydawnicza ........217
3.5. Rekolekcje radiowe ........218
3.6. Związek z Dziełem Lasek ........218
4. Cechy charakteru........219
4.1. Inteligencja i pracowitość........219
4.2. Aktywność i impulsywność........220
4.3. Odwaga i męstwo ........220
4.4.Komunikatywność i poczucie humoru........221
4.5. Wielkoduszność i ofiarność........221
4.6. Wierność powołaniu........222

*Ks. Andrzej Steckiewicz*......224
*OBRAZ „JEZU, UFAM TOBIE" NA BIAŁORUSI W LATACH 1956-1986*......224
Wstęp 224
1. Parafia pw. św. Jerzego w Nowej Rudzie. Rys historyczny......224
2. Ks. Kanonik Józef Grasewicz – curriculum vitae ......231
3. Obraz Jezusa Miłosiernego „Jezu ufam Tobie" - geneza powstania, koleje losu ......234
4. Kult Miłosierdzia Bożego na Białorusi......239
a). Świadectwo prałata Antoniego Chańko dotyczące wspomnień o ks. Grasewiczu. ..244
b). Wspomnienia prałata Wincentego Lisowskiego. ......245
c) Świadectwo o. dr Andrzeja Szczupała CSsR proboszcza parafii pw. Św. Jerzego w Nowej Rudzie......246
Rozmowa z Ks. Olegiem Piwowarem ......248
c) Alina Novikova ......248
Zakończenie ......249

*Agnieszka Malczewska - Błaszczyk* ......253
*POSTAL – STRES W PRACY, JAKO KATALIZATOR – OMÓWIENIE GENEZY ZJAWISKA 253*
Geneza terminu Postal. ......253
Stres – pojęcie, skala......253

*Кс. д-р Юрый Жэгарын* ......266
*НОВЫЯ НОВЫЯ МЕДЫЯ – НЕБЯСПЕКА ЦІ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ НОВАЙ ЕВАНГЕЛІЗАЦЫІ?* ......266

*mgr Artur Wójtowicz* ......276
*SHERLOCK HOLMES PRZYKŁADEM LITERACKIEJ DYWAGACJI NAD MORMONAMI SIR ARTHURA CONAN DOYLE'A*......276
Arthur Conan Doyle, zagubiony wyznawca ......276
„Studium w szkarłacie" i jego powiązania z mormonami......277
Krytyka „Studium w szkarłacie" w stanie Virginia ......280